© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Бацькаўшчына

ВОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „BAĆKAUŠČYNA“ („VATERLAND“)

Herausgeber: Wladimir BORTNIK

Postadresse: Die Weissruthenische Zeitung „Baćkauščyna“ („Das Vaterland“), (13 b) München 19, Schliessfach 69.

Druck. „LOGOS“, Buchdruckerei u. Verl., G.m.b.H., München 19, Bothmerstr. 14

Цана: Нямеччына (іншыя эўрапэйскія краіны бяз Францыі й паўдзённаамэрыканскія краіны»: год — 25 н. м.; паўгода — 12,5 н. м.; ЗША й Канада: год — 13 дал.; паўгода — 6,5 дал.; Ангельшчына й Аўстралія: год — 60 шыл.; паўгода — 30 шыл.; Францыя: год — 25 н. ф.; паўгода — 12,5 н. ф. Перасылка лётніцкай поштай у ЗША й Канаду каштуе падвойна, у Аўстралію й краіны Паўднёвай Амэрыкі — патройна. Падвойныя нумары каштуюць падвойна.

Банковае конто: Zeitung „Baćkauščyna“, Konto Nr. 357-125, Bay. Hypotheken- u. Wechselbank, München.

ЦАНА 50 Н. ФЭН. — PREIS 50 Pf.

LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE“ | DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND“ | THE BELORUSSIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND“

№ 3 (587) Мюнхэн, Нядзеля 28 сьнежаня 1962 г. — München, Sonntag, 28 Januar 1962. ГОД ВЫДАНЬНЯ 16

Паралюш Задзіночаных Нацыяў

Дзяржаўныя кіраўнікі, вядучыя палітыкі й прэса Захаду апошнім часам аднагодна гавораць аб глыбокім крызысе Задзіночаных Нацыяў ды прабуюць шукаць нейкага выхаду зь яго. На нашую-ж думку, будзе далёка недастатковым назваць той стан, у якім апынулася гэтая сьветавая арганізацыя, адно толькі крызысам. Тут ужо прыходзіцца гаварыць, калі не аб банкроцтве, дык прынамся аб поўным паралюшу Задзіночаных Нацыяў, які ўсьцяж яшчэ паглыбляецца й выхаду зь якога, пры прапанаваных сяньня поўсяродках, абсалютна ня відаць.

XV сэсія Генэральнай Асамблеі ЗН, якая адбывалася ў Нью Ёрку летам і восеняй 1960 г., ашчэ была на Захадзе прадметам вялікае ўвагі й напружанай цікавасьці не таму, што мела разьвязаць важныя палітычныя праблемы й канструктыўна правесьці ў жыцьцё прынятыя пастановы, — такіх сонечных ілюзіяў ня было ў нікога ўжо тады, — але толькі таму, што, дзякуючы нябывалым у дыпляматычнай практыцы авантурам Хрушчова, давала шмат матарыялу для сэнсацыі. Сёлетная-ж XVI сэсія Генэральнай Асамблеі ЗН, якая цяпер адбываецца ў Нью Ёрку, ня мае ў сабе навет і сэнсацыйнага элемэнту й не знаходзіць шырэйшага водгуку ў заходняй прэсе. І гэта ўзноў-жа не таму, што на ейным парадку дня стаяць малаважныя пытаньні, — наадварот, многія пытаньні зьяўляюцца першараднай палітычнай вагі, — але галоўна таму, што згары ведама, што прынятыя ў гэтых пытаньнях пастановы астануцца адно на паперы й ня будуць праведзеныя ў жыцьцё. Больш таго, дзяржавы камуністычнага блёку, а за імі й некаторыя г. зв. нэўтральныя дзяржавы ўжо падчас галасаваньня над непажаданымі для іх пастановамі афіцыйна заяўляюць, што ня будуць ім падпарадкоўвацца.

Сьмяротная хвароба Задзіночаных Нацыяў была дапушчаная ўжо ў мамэнт іхнага нараджэньня ў 1945 годзе ў Сан Францыско, калі на прадбачлівае патрабаваньне Савецкага Саюзу, было ўведзенае ў статут ЗН права вэта для сталых сяброў Рады Бясьпечнасьці, гэтага найважнейшага органу ЗН. Да гэтага часу Савецкі Саюз ужо 99 разоў выкарыстаў сваё права вэта, тарпэдуючы гэтым нявыгадныя для сваей палітыкі пастановы. І толькі адзін адзіны раз, калі савецкая дэлегацыя байкатавала Раду й ня прыймала ўдзелу ў ейных паседжаньнях, удалося правесьці правамоцную пастанову, непажаданую для Савецкага Саюзу. Гэта ў справе збройнага ўмяшаньня ЗН у карэйскую вайну, што ў сваім канчальным выніку выратавала Паўдзённую Карэю ад камуністычнай інвазіі. Але гэта быў адно толькі шчасьлівы прыпадак, які болей не паўторыцца.

Праўда, старпэдаваныя савецкім вэтам пастановы Рады Бясьпечнасьці могуць быць прынятыя Генэральнай Асамблеяй ЗН, дзе права вэта ня існуе. Але такая працэдура робіць немагчымай безадкладную акцыю ЗН, што ў выпадку збройнае агрэсіі, як у ўспомненым карэйскім канфлікце, мае кардынальнае значаньне. Ува ўсіх-жа іншых выпадках паўтарэньне на Генэральнай Асамблеі няпрынятых з прычыны савецкага вэта ў Радзе Бясьпечнасьці пастановаў яшчэ мела свой сэнс. Але гэта было даўно, пакуль заходнія дзяржавы, у першую чаргу Амэрыка, мелі ў ЗН загарантаваную бальшыню. Але пачынаючы ад XV сэсіі, на якой былі прынятыя ў склад ЗН многія новыя афра-азіяцкія дзяржавы, гэтай гарантыі ўжо няма. Як ведама, г. зв. нэўтральныя або, як іх яшчэ называюць, незаангажаваныя афра-азіяцкія дзяржавы, — а іхны лік будзе яшчэ ўсьцяж павялічвацца, — часта галасуюць разам з камуністычным блёкам супраць інтарэсаў Захаду, ствараючы у ЗН абсалютную бальшыню. Гэтак калі Саветы выкарысталі 99 раз права вэта ў Радзе Бясьпечнасьці супраць асуджэньня агрэсіі Індыі ў Гоа, Захад ужо ня ськіраваў гэтае справы ў Генэральную Асамблею ЗН, бо ня мог разьлічваць на бальшыню.

Другой хваробай, пасьля злоўжываньня права вэта, зьяўляецца адмова дзяржаваў камуністычнага блёку, а за імі нярэдка й дзяржаваў нэўтральных падпарадкоўвацца пастановам, правамоцна прынятым Генэральнай Асамблеяй. Прыкладам, Савецкі Саюз не ўважаў за патрэбнае зрабіць хоць-бы прылікі, што ён намераны выконваць пастановы, прынятыя на аднэй з папярэдніх сэсіяў у справе Вугоршчыны. Такое сабатаваньне пастановаў ЗН стварае фікцыю таго, што зьяўляецца заданьнем гэтае сьветавае панаддзяржаўнае арганізацыі.

На перадапошняй сэсіі Генэральнай Асамблеі ў 1960 г. Хрушчоў павёў генэральную атаку супраць ЗН, высунуўшы дамаганьне грунтоўнае рэарганізацыі выканальнага органу ЗН — сэкратарыяту. Замест аднаго генэральнага сакратара, ён запрапанаваў трох раўнапраўных генэральных сакратароў — аднаго ад заходніх дзяржаваў, аднаго ад камуністычнага блёку й аднаго ад нэўтральных дзяржаваў, прычым кажны із сакратароў меў-бы карыстацца правам вэта. Ясна, што ў выпадку такой рэарганізацыі сакратарыяту, ЗН страцілі-б навет і тую сілу, якую маюць яны часамі яшчэ сяньня, і сталіся-б поўнасьцяй залежнымі ад савецкіх капрысаў.

Калі ў мінулым годзе ў сувязі з трагічнай сьмерцяй тагачаснага генэральнага сакратара ЗН Дага Гамэршыльда трэба было выбіраць новага сакратара, дык Савецкі Саюз сваё дамаганьне з усёй настойлівасьцяй паўтарыў. Праўда, потым адмовіўся ад гэтага дамаганьня, і быў аднагалосна выбраны генэральным сакратаром з ранейшымі паўнамоцтвамі бірманскі прадстаўнік У Тант на час заканчэньня кадэнцыі Гамэршыльда, г. зн. да вясны 1963 году. Гэтая ўступка Савецкага Саюзу была падыктаваная вельмі малой надзеяй, што ў сяньняшніх умовах удасца ім здабыць патрэбную бальшыню, каб правесьці рэарганізацыю сакратарыяту ЗН. Але, як выказваецца Заходняя прэса, Амэрыка мусіла зрабіць шмат вяжучых забавязаньняў некаторым нэўтральным дзяржавам. Дык і гэтае разьвязаньне справы генэральнага сакратара зьяўляецца адно часовым. Справа гэтая, зь нечаканымі вынікамі, паўторыцца вясной 1963 году.

Нармальную дзейнасьць Задзіночаных Нацыяў апошнім часам пачала паралізаваць дзіўная пазыцыя нэўтральных дзяржаваў Азіі, Афрыкі й некаторых дзяржаваў Лацінскай Амэрыкі. Яны пачалі тарнаваць г. зв. «падвойную ма-

(Заканчэньне на 2-ой бачыне)

Жыльлёвае будаўніцтва ў БССР

На XXII зьезьдзе камуністычнай партыі Хрушчоў у сваім дакладзе з гонарам паведаміў удзельнікам зьезду, што праграма жыльлёвага будаўніцтва за 1955-1960 гады поўнасьцяй і пасьпяхова выкананая. Паводля падлікаў Хрушчова, ужо 50 мільёнаў чалавек, або амаль чвэрць усяго насельніцтва Савецкага Саюзу атрымалі новыя ўпарадкаваныя кватэры. Паводля тэмпаў жыльлёвага будаўніцтва, Савецкі Саюз, паводля Хрушчова, займае цяпер першае месца ў сьвеце. Хрушчоў дадаў, што апошнімі гадамі ў Савецкім Саюзе на тысячу чалавек будуецца кватэраў у два разы больш, чымся ў Ангельшчыне й Італіі. Хрушчоў не прыпадкова ня прыгадаў Нямецкай Фэдэратыўнай Рэспублікі, бо першае месца паводля колькасьці пабудаванай жыльлёвай плошчы на асобу займае не Савецкі Саюз, як цьвердзіць Хрушчоў, а Заходняя Нямеччына.

Бяручы агулам, за пасьляваенныя гады ў СССР пабудавана ня мала. Нас, аднак, найбольш цікавіць як праходзіць жыльлёвае будаўніцтва ў Беларусі. Ведама, што з усіх савецкіх рэспублік Другая сусьветная вайна найбольш спустошыла Беларусь. Савецкія крыніцы падаюць адносна гэтага наступныя дадзеныя:

У Беларусі было спалена 209 гарадоў і раённых цэнтраў, 2 тысячы 200 сёлаў і вёсак, 10 тысяч 338 прадпрыемстваў, больш за 6 тысяч школьных будынкаў, амаль усе вышэйшыя навучальныя і навукова-дасьледчыя ўстановы, тэатры, клюбы, музэі. У сельскай мясцовасьці Беларусі было спалена адзін мільён 200 тысяч жылых дамоў і іншых будынкаў. У выніку, пасьля вайны мільёны Беларусаў былі змушаныя жыць у сырых прымітыўных зямлянках. Здавалася-б, што савецкі ўрад павінен быў-бы змабілізаваць усе сродкі, каб у першую чаргу дапамагчы Беларусам атрымаць людзкія жыльлёвыя ўмовы. Аднак як паказваюць савецкія статыстычныя дадзеныя, за 13 пасьляваенных год у зруйнаванай вайной Беларускай ССР было пабудавана на душу насельніцтва не больш жыльлёвай плошчы, як гэтага трэба было спадзявацца, а амаль-што найменш — у параўнаньні зь іншымі рэспублікамі. Так, напрыклад, у Расейскай Фэдэрацыі, якая мела прапарцыянальна куды меншыя ваенныя разбурэньні за БССР, было пабудавана на душу насельніцтва два разы больш жыльлёвай плошчы, чымся ў зруйнаванай дашчэнту Беларусі.

Гэтай выразнай дыскрымінацыяй Беларусі з боку маскоўскіх плянавых органаў не канчаецца трагедыя з жыльлёвымі ўмовамі ў БССР. Сюды даходзіць яшчэ якасьць савецкага будаўніцтва.

Як ведама, найбольшае жыльлёвае будаўніцтва праводзіцца ў сталіцы Беларусі Менску: у горадзе, у якім сканцэнтраваныя шматлікія буйныя прамысловыя падпрыемствы і які на 90 працэнтаў быў зьнішчаны вайной. Цяпер у Менску налічваецца больш за 570 тысяч насельніцтва, тады як перад вайной у ім жыло толькі 270 тысяч. Таму кватэрны крызіс у Менску адчуваецца больш, як у іншых гарадох. У Менску пабудавана ня мала, але як!?

Вось адзін характэрны прыклад. У Менску на Палявой вуліцы сёлета летам быў заселены новапабудаваны дом. Але не пасьпелі шчасьлівыя сем'і агледзецца і прызвычаіцца да новых умоваў жыцьця, як ува ўсіх кутках кватэры выявіліся вялікія недаробкі, якія з кожным днём павялічаліся. Радасьць навасёлаў зьмянілася смуткам, крыўдай і нават злосьцяй. Будаўнічыя арганізацыі зь вялікім спрытам і майстэрствам прыкрылі сваю неахайную працу фарбай і шпаклёўкай. Падлога ў кватэрах была так памаляваная, што пасьля некаторага часу фарбы на падлозе зусім не засталося, бо яна папрыставала да абутку жыхароў. Дзьверы й ваконныя рамы паперасыхалі й паперакручваліся. Каналізацыйныя трубы пацяклі й засмуродзілі кватэру.

Такіх прыкладаў можна падаць шмат, нават карыстаючыся толькі весткамі з савецкай беларускай прэсы. Яны зьяўляюцца найлепшым камэнтарам да ўсіх тых лікавых паказчыкаў, якімі хваліцца Хрушчоў і ўся савецкая прапаганда. Яны таксама найлепш сьветчаць аб гаспадарчай эфэктоўнасьці ўсёй савецкай эканамічнай сыстэмы.

Пададзеныя намі факты з палажэньня на Беларусі падкрэсьліваюць асаблівую нядолю нашага беларускага народу, здадзенага на ласку й няласку маскоўскага імпэрыялістычнага цэнтру.

ВБ-БР

Зварот Прэзыдэнта БНР да Беларускага Народу

Прэзыдэнт Рады БНР сп. Мікола Абрамчык, будучы ў Рыме на Міжнароднай канфэрэнцыі аб палітычнай вайне з бальшавізмам у канцы мінулага году, быў запрошаны потым кіраўніком беларускіх радыяперадачаў Ватыканскага радыя выступіць із зваротам праз гэтае радыё да беларускага народу.

Прэзыдэнт Абрамчык у сваім выступленьні, якое заняло поўнасьцяй 15-хвілінную праграму беларускае радыяперадачы, паінфармаваў суродзічаў на бацькаўшчыне аб працы беларускае эміграцыі ў вольным сьвеце наагул і ў васаблівасьці аб дзейнасьці Рады і Ўраду Беларускае Народнае Рэспублікі на выгнаньні. У канцы сваей прамовы прэз. Абрамчык заклікаў беларускі народ ня падаць духам, моцна верыць у канчатковую нашую перамогу над нашымі ворагамі-акупантамі ды ня верыць рознай бессаромлівай бальшавіцкай хлусьні, якую яны распаўсюджваюць на бацькаўшчыне аб беларускай эміграцыі й асабліва аб Радзе і Ўрадзе БНР. Прамова прэзыдэнта была закончана пераданьнем нацыянальнага гімну «Мы выйдзем шчыльнымі радамі».

Незадоўга з Рыму праз Парыж прэз. Абрамчык выехаў у Амэрыку, дзе ён мае намер адведаць беларускія асяродзьдзі ў ЗША й Канадзе.

Азнакі нацыі адміраюць, а нацыі ўсьцяж існуюць

Падобную анамалію ў савецкай рэчаіснасьці нядаўна толькі спасьцярог сакратар Аддзелу грамадзкіх навук АН СССР акадэмік Е. Жукаў у сваім дырэктыўным артыкуле «XXII зьезд КПСС і заданьні савецкіх гісторыкаў». У сувязі з гэтым ён зазначыў, што савецкія гісторыкі павінны перагледзіць папярэдняе сталінскае абазначаньне (прызнакі) нацыі, а таксама формулу пра тое, што, калі адсутнічаюць тыя ці іншыя асаблівасьці нацыі, дык ня існуе й самое нацыі («Вопросы истории», № 12, 1961).

Як ведама, Сталін сьцьвярджаў, што нацыя ня толькі зьяўляецца гістарычнай катэгорыяй, а гістарычнай катэгорыяй азначанай эпохі — эпохі капіталізму ў ягоным першапачатковым разьвіцьці. Да асаблівасьцяў нацыі ён адносіў: супольнасьць тэрыторыі, эканамічную супольнасьць, супольнасьць мовы й супольнасьць псыхічнага складу, якая праяўляецца ў супольнасьці культуры. Дзяржаўную супольнасьць ён адкідаў як не абавязковы прызнак, бо, як ён зазначаў, прыклад Расейскай імпэрыі ці Расеі паказвае, што нацыі могуць існаваць і без свае нацыянальнае дзяржаўнасьці.

З чым можна згадзіцца із Сталінам, а з чым не? Бязумоўна, нацыя зьяўляецца гістарычнай катэгорыяй, бо яна ўзьнікае, разьвіваецца й дасьпявае ў гісторыі. Яна, аднак, ня ёсьць гістарычнай катэгорыяй азначанай эпохі, у дадзеным выпадку эпохі капіталізму. Папершае, пад пытаньнем стаіць, дзе пачынаецца й дзе канчаецца гэты капіталізм. Калі-ж браць за аснову савецкі падзел на гэтыя эпохі капіталізму й сацыялізму й г. д., а таксама гэтае сталінскае палажэньне, што нацыя зьяўляецца гістарычнай катэгорыяй «азначанае» эпохі ці прадуктам капіталізму, дык у дадзеным выпадку трэба ўжо даўно было-б сьцерці з карты гісторыі падсавецкія, хоць і «сацыялістычныя», нацыі, а таксама прызнаць тую праўду, што ў Расейскай імпэрыі ўжо даўно павінна была-б скласьціся адна нацыя, г. зн. у XVIII-XIX стагодзьдзях, калі, згодна цьверджаньня савецкіх гісторыкаў, тут пачаў разьвівацца капіталізм. Запраўды, бо апрача таго, што савецкія гісторыкі й узьнікненьне нацыянальных дзяржаваў зьвязваюць з капіталізмам, і што іншыя ўмовы садзейнічалі апошняму працэсу, як эканамічная супольнасьць, дзяржаўная супольнасьць, хоць Сталін яе й адкідаў і нарэшце імкненьні да культурнае супольнасьці — культурная й моўная русыфікацыя.

Тэрытарыяльная і моўная супольнасьць, ведама, неабходныя элемэнты нацыі. Неабходным ейным элемэнтам зьяўляецца псыхічны склад, які, аднак больш зьвязаны зь гістарычнай супольнасьцяй, з прыроджанасьцяй і менш з культурай. Псыхіка нацыі больш устойлівая й яна ўзьдзейнічвае на культуру, у той час, як апошняя лёгка паддаецца чужым уплывам, а ў няспрыяльных умовах навет замірае. Культура толькі ў некаторай ступені можа быць азнакай нацыі. Чыста нацыянальнай культуры ня было й ня можа быць, бо культура — прадукт усяго людзтва. Наадварот, эканамічная супольнасьць не зьяўляецца гэтым неабходным элемэнтам нацыі. Замкнутай нацыянальнай эканомікі ніколі ня існавала й ня можа існаваць. Была толькі нацыянальная прадукцыя, а спажывалася ўсё тое, што й дзе толькі можна было дастаць.

Сталін прапусьціў адзін вельмі важны момант — гістарычную, у тым ліку й дзяржаўную супольнасьць. Бяз гэтае супольнасьці запраўды ня можа быць нацыі, г. зн. нацыянальна й дзяржаўна сьпелага народу. Няважна, што ў дадзены момант ці ад нейкага часу нацыя ня мае свае дзяржаўнасьці, але каб стацца сьпелай нацыяй, яна павінна была прайсьці праз сваё нацыянальна-дзяржаўнае жыцьцё, мець моцную гістарычную традыцыю свае апрычонасьці.

З прычыны апошніх недастаткаў сталінскай ці наагул савецкай канцэпцыі пра нацыі ў Савецкім Саюзе ўжо многа разоў абвяшчалі пра адміраньне ці нямінучае адміраньне старых падсавецкіх нацыяў і ўтварэньне новае савецкае нацыі. Асабліва гэтае пытаньне стала войстрым з 1959 году (паход да «камунізму»), і некаторыя савецкія гісторыкі й сацыялёгі, ды навет і сам Хрушчоў, выходзячы з тых чатырох сталінскіх асаблівасьцяў нацыі, амаль заўважалі, што ў СССР ужо ня існуе нацыяў. На шляху да зьліцьця падсавецкіх народаў у вадзіную «савецкую» ці «камуністычную» нацыю стаяла толькі мова, і вось Хрушчоў выдае дэкрэт пра зьнішчэньне нацыянальных моваў мэтадам насаджэньня расейскае мовы. Дэкрэтам і засільлем аднак ня можна дасягнуць мэты ў кароткі тэрмін, а таму на XXII зьезьдзе КПСС ён мусіў усё-ткі прызнаць, што працэс адміраньня моваў зьяўляецца доўгім працэсам,

Успомнены акадэмік Е. Жукаў не паведаміў, у якім кірунку будуць пераглядацца папярэднія сталінскія «прызнакі» нацыі. Ён сказаў толькі, што яны «бяз грунтоўных агаворак» ня могуць больш тарнавацца да «сяньняшніх сацыялістычных нацыяў Савецкага Саюзу». Значыцца, агульна сталінская канцэпцыя як-бы застаецца ў сіле; яна толькі няпрыгодная для падсавецкіх «сацыялі-

(Заканчэньне на 2-ой бачыне)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Паралюш Задзіночаных Нацыяў

(Заканчэньне зь 1-ай бач.)

ральнасьць» — іншую ў дачыненьні да Захаду й зусім іншую ў дачыненьні да камуністычнага блёку. Гэтак яны, за прыкладам Савецкага Саюзу, абвінавачваюць Захад у каляніялізьме й імпэрыялізьме, тады калі ад гэтых грахоў гісторыі Захад ужо поўнасьцяй вызваліўся, дабравольна даў дзяржаўную незалежнасьць сваім былым калёніям і выдатна іх сяньня падтрымлівае матарыяльна й палітычна. І наадварот, гэтыя дзяржавы, у карысьць Савецкага Саюзу, ня хочаць бачыць найжахлівейшых у гісторыі формаў каляніялізму апошняга, як і бессаромліва зажмурваюць вочы на ягоную ультра-імпэрыялістычную палітыку.

А вось іншы вымоўны прыклад тарнаваньня нэўтральнымі дзяржавамі «падвойнае маральнасьці». На цяперашняй сэсіі яны толькі нявыразна й мімаходам выступалі супраць праведзеных мінулым летам сэрыйных пробных выбухаў атамных бомбаў у Савецкім Саюзе, які гэтым зламаў узятыя на сябе раней забавязаньні, затое з куды большай гвалтоўнасьцяй яны асуджалі Задзіночаныя Штаты за тое, што апошнія намераныя адно ў будучыні й адно ў вадказ на савецкія сэрыйныя выбухі правесьці свае выпрабаваньні атамных бомбаў. Адначасна, супраць галасоў Амэрыкі, Вялікабрытаніі й бальшыні дзяржаваў НАТО, была пастаноўленая генэральная забарона атамных выбухаў і то бязь ніякае кантролі, а так-жа пастанова, што на тэрыторыі Афрыкі ня будуць адбывацца атамныя пробныя выбухі. Амэрыка, плянуючы ўзнавіць у недалёкай будучыні пробныя атамныя выбухі, упяршыню будзе змушаная нарушыць пастанову ЗН.

Да ўсіх гэтых хранічных хваробаў ЗН апошнім часам далучылася й хвароба фінансавага характару. Нармальныя сяброўскія складкі плацяць, больш або менш пунктуальна, усе чыста дзяржавы, у тым ліку Амэрыка амаль адну трэйцюю часьць (32%). Затое на вайсковую акцыю ЗН ў раёне Газы на ізраэльска-эгіпскай граніцы, у затоцы Акаба і ў Конга плацяць толькі некаторыя дзяржавы, у іхным ліку Амэрыка аж 47% з палавінаю, а дзяржавы камуністычнага блёку, Бэльгія, Францыя й Паўдзённа-Афрыканская Вунія — гэтыя апошнія із зусім іншых матываў — ня плацяць абсалютна нічога. Дзякуючы гэтаму ЗН на сяньня маюць ужо 200 мільёнаў даляраў дэфіцыту, які пастаноўлена пакрыць расьпісаньнем аблігацыяў задоўжанасьці. Урад ЗША згадзіўся выкупіць гэтых аблігацыяў на суму 100 мільёнаў даляраў, якую ўставіў у свой бюджэт. Але, узноў-жа, і гэтае мерапрыемства мае адно правізарычны й часовы характар.

Праўда, справа фінансаваньня мілітарных акцыяў ЗН ужо ськіраваная ў Міжнародны Трыбунал у Гаазе. Калі гэты Трыбунал пастановіць, што гэтыя расходы зьяўляюцца абавязваючымі для ўсіх сяброў ЗН і калі пасьля гэтага некаторыя дзяржавы ня будуць плаціць належных складак на надзвычайныя акцыі ЗН, дык яны, згодна статуту ЗН, за два гады страцяць права голасу ў ЗН.

Напасьледак, частыя разыходжаньні сярод самых заходніх дзяржаваў у кардынальных пытаньнях міжнароднае палітыкі пераносяцца й на форум ЗН, што таксама абніжае сілу й прэсьціж гэтае арганізацыі. Найвымоўнейшым прыкладам такіх разыходжаньняў, якія балюча адбіліся на прэсьціжы ЗН, было нядаўнае збройнае ўмяшаньне ЗН у нутраныя справы Конга, калі войскі ЗН павялі запраўдную вайну супраць найбольш празаходняй і антыкамуністычнай правінцыі Конга Катангі, з чаго меў вялікую ўцеху адно Савецкі Саюз.

Вось гэтыя ненармальнасьці й былі прычынай, што навет дзяржаўныя мужы заходніх дзяржаваў былі змушаныя загаварыць адкрыта аб крызысе Задзіночаных Нацыяў і патрабаваць карэннай рэвізіі пазыцыяў сваіх дзяржаваў у дачыненьні да ЗН. Гэтак, калі ў Радзе Бясьпечнасьці з прычыны савецкага вэта правалілася прыгатаваная Амэрыкай, Ангельшчынай, Францыяй і Турэччынай рэзалюцыя з асуджэньнем агрэсіі Індыі супраць Гоі, дэлегат ЗША Стывэнсэн, высоўваючы прынцыповы характар гэтае справы, паставіў пытаньне, ці ня ёсьць гэта наагул «пачаткам канца» Задзіночаных Нацыяў. Старшыня камісіі замежных справаў сэнату ЗША, уплывовы амэрыканскі палітык сэнатар Фульбрайт, абвінавачваючы афра-азіяцкія дзяржавы, якія вызнаюць савецкі прынцып, што агрэсія не зьяўляецца агрэсіяй, калі яе дапускаецца адна зь іх, высунуў зусім новую й сьмелую ідэю. Ён заапэляваў да вольных краінаў задзіночыцца ў новай арганізацыі, якая падмяніла-б маральна збанкрутаваныя Задзіночаныя Нацыі.

Але найвайстрэй выступіў супраць ЗН брытанскі міністар замежных справаў Лёрд Гом у сваей прамове ў канцы мінулага месяца ў горадзе Бэруік. Выходным пунктам ягонае прамовы была ацэна галасаваньня ў Радзе Бясьпечнасьці ў справе індыйскае агрэсіі ў Гоі. Наагулжа брытанскі міністар абвінаваціў новых сяброў ЗН, што яны сваім разуменьнем каляніялізму й імпэрыялізму робяць вялікую ўслугу Крамлю. Ён падчыркнуў, што закладчыкі ЗН павінны паставіць пытаньне, ці гэтая сьветавая арганізацыя ў сваіх пачаткавых прынцыпах і формах наагул яшчэ існуе й можа заслугоўваць на далейшае падтрыманьне.

Праўда, у сваім навагоднім пасланьні да амэрыканскае нацыі прэзыдэнт Кэнэды назваў Задзіночаныя Нацыі «інструмэнтам нашай палітыкі й нашай надзеяй». Але словы гэтыя зьяўляюцца вельмі мала пераконваючымі. Таксама вельмі мала пераконваючымі выдаюцца й пагадненьні нарады амэрыканскае й брытанскае дэлегацыяў у ЗН, адбытай 11—13 студзеня перад узнаўленьнем пасьля каляднага перарыву сэсіі ЗН. Хаця некаторыя разыходжаньні ў пазыцыі ЗША і Вялікабрытаніі ў ЗН на нарадзе ня былі зьліквідаваныя, тым ня меней абедзьве дзяржавы згадзіліся на пазытыўныя дачыненьні да ЗН і на падтрымліваньне ў будучыні акцыі гэтае арганізацыі. Гэтыя й ім падобныя дэкларацыі ЗША і Вялікабрытаніі зьяўляюцца, здаецца, адно ўласьцівым дзяржаўным кіраўніком Захаду ўхіляньнем ад канечнасьці радыкальнае разьвязкі й адкладаньнем справы на будучыню ў самаабманнай надзеі, што «неяк-жа ды будзе».

Уся прычына банкроцтва Задзіночаных Нацыяў ляжыць у тым, што ейныя сябры маюць перад сабой узаемна супярэчныя мэты. Галоўным заданьнем Задзіночаных Нацыяў, сфармуляваным у іхнай карце, ёсьць захоўваньне сьветавага міру на базе прыязных узаемных дачыненьняў і супрацоўніцтва ўсіх дзяржаваў — сяброў ЗН. Іншымі словамі, перадумовай жыцьцяздольнасьці й працаздольнасьці ЗН зьяўляецца згоднае суіснаваньне розных палітычных і сацыяльных сыстэмаў у сьвеце. Паколькі-ж Савецкі Саюз і ўвесь камуністычны блёк зусім іншае прыдаюць значэньне паняцьцю мірнага суіснаваньня й зусім іншае дзяржавы вольнага сьвету, патолькі ўсе натугі дзеля ратаваньня ЗН будуць дарэмныя.

У такіх умовах ранейшая ці пазьнейшая сьмерць ЗН зьяўляецца няўхільнай. Бо замест выслухоўваць і талераваць камуністычную дэмагогію й прапаганду, праводжаную на форуме ЗН, Захад, як ужо запрапанаваў амэрыканскі сэнатар Фульбрайт, будзе змушаны шукаць іншых, больш рацыянальных і эфэктоўных формаў міжнароднага супрацоўніцтва.

Язэп Каранеўскі

АБАВЯЗКАМ КАЖНАГА БЕЛАРУСА ЁСЬЦЬ ЧЫТАЦЬ, ПАШЫРАЦЬ І ПАДТРЫМЛІВАЦЬ «БАЦЬКАЎШЧЫНУ».

Гэтак выглядаюць савецкія „рэгабілітацыі“

У № 102 «Літаратуры і Мастацтва» за 26 сьнежаня 1961 году ў рубрыцы «На старонках «Анталёгіі беларускае паэзіі» знаходзім два вершы Ўладзімера Жылкі «Меч» і «Я люблю густыя шумы» ды наступную біяграфічную зацемку аб іхным аўтары: «Уладзімер Жылка нарадзіўся ў вёсцы Макашы Нясьвіскага раёну Менскай вобласьці. Скончыў гарадзкое чатырохкляснае вучылішча, сельска-гаспадарчае вучылішча і гісторыка-філялягічны факультэт Праскага ўнівэрсытэту. У 1926 годзе прыехаў у Менск, дзе працаваў у рэдакцыях рэспубліканскіх газэт. Першы зборнік Жылкі «Уяўленьне» выйшаў у Вільні ў 1923 г. За ім выйшла кніга «На ростані» (1924 г.), а ў 1926 г. зборнік «З палёў Заходняй Беларусі». Памёр Жылка ад цяжкай хваробы ў 1933 годзе».

У тэй-жа рубрыцы ніжэй надрукаваны верш Алеся Салагуба «Восень у астрозе», папярэджаны наступнай біяграфічнай зацемкай аб гэтым паэце: «Алесь Салагуб нарадзіўся ў 1906 годзе ў вёсцы Друдзічы на Віленшчыне. Скончыў Віленскую беларускую гімназію. За рэвалюцыйную дзейнасьць неаднаразова арыштоўваўся белапольскімі ўладамі. У 1928 годзе пераехаў у Менск, вучыўся ў Беларускім Дзяржаўным унівэрсытэце. У 1929 годзе выдаў зборнік «Лукішкі». Памёр у канцы трыццатых гадоў».

У вабедзьвюх біяграфічных зацемках не пададзеныя найважнейшыя факты з жыцьця абодвых паэтаў, а таму ў непаінфармаванага чытача можа зьявіцца аб іх хвальшывае й выкрыўленае ўяўленьне. Таму дазволім сабе тут паінфармаваць нашых чытачоў аб тых важных фактах, якія тэндэнцыйна прамаўчала «Літаратура і Мастацтва».

Пра Жылку ў «Літаратуры і Мастацтве сказана: «Памёр Ул. Жылка ад цяжкай хваробы ў 1933 годзе». Але ў якіх абставінах і ад якой гэта «цяжкай хваробы» памёр паэта, аб гэтым ані слова. Дык вось-жа дапаўняем інфармацыю савецкай газэты: Уладзімер Жылка, як сотні й тысячы іншых зь беларускай інтэлігенцкай моладзі ў той час, быў арыштаваны ў 1930 годзе, як беларускі «нацыянальны дэмакрат». А ў наступным 1931 годзе быў высланы ў Узгум, Вяцкай акругі блізка Уралу на пяць гадоў, дзе ў няволі памёр 1-га сакавіка 1933 году. Перад самай сьмерцяй ён там-жа напісаў апошні свой выдатны твор «Тэстамант», які пашыраўся ў рукапісах сярод паэтавых сяброў выгнаньня, а ўпяршыню быў надрукаваны ў менскай «Беларускай Газэце» за 6-га жніўня 1942 г., ды потым перадрукоўваўся на эміграцыі, між іншым у выдадзеным у 1955 годзе ў Нью Ёрку пад рэдакцыяй праф. Адамовіча зборніку Ул. Жылкі «Творы».

У гэтым прыгожым і глыбокім паводля ідэйнага зьместу творы паэта робіць справаздачу із свайго кароткага жыцьця й паэтычнай дзейнасьці ды пакідае суродзічам свой тэстамант — любіць сваю бацькаўшчыну Беларусь гэтаксама, як моцна любіў яе сам Жылка. Вось ягоныя натхнёныя словы разьвітаньня з жыцьцём далёка ад бацькаўшчыны, якімі канчаецца «Тэстамант»:

Я пакідаю зь дзіўным сумам
Маю дабродзейку зямлю.
Я голад знаў, душыўся глумам,
Ды імі сэрца не кармлю.
Яна ўсяго, як толькі ўздумаць,
Дала, й такой яе люблю:
Зь бядою, зь ліхам, з посным квасам
І з радасьцяй кароткай часам.

Бывай, надзей сардэчны ўздым!
Бывайце, сны і соладзь веснаў!
І вы, сьнягі, завеі зім!
На зломе дзьвюх эпох злавесных,
У няспрыяльным ветры злым,
Сваё жыцьцё прайшоў я чэсна:
Пясьняр, змагар, бядняк празь век, —
Быў перш за ўсё я чалавек.
Бывай, мой ранак срыбраросы!
Бывай, мой дзень клапот, пакут!
Прайшоўшы сьвет разьдзетым, босым,
Пара падумаць і пра кут:
На могілках зацішных Росы
Хачу спачыць ад каламут.
Сачыцьмуць мой спакой найпільней
Муры старой, каханай Вільні.

У біяграфічнай зацемцы пра Салагуба сказана: «Памёр у канцы трыццатых гадоў». Узноў-жа тэндэнцыйна прамоўчваецца найважнейшае, пайменна тое, што Алесь Салагуб, хутка пасьля пераезду зь Вільні ў Менск, быў арыштаваны органамі НКВД і ў пачатку трыццатых гадоў расстрэлены ў падвалах менскае турмы.

Я добра ведаў Алеся Салагуба, як майго, малодшага на адну клясу, калегу зь Віленскай Беларускай Гімназіі. Гэта быў зусім адменны ад іншых вучняў юнак: вельмі паважны й заўсёды заглыблены думкамі ў розныя жыцьцёвыя й ідэялягічныя праблемы. Быў фанатычным беларускім патрыётам. З маладосьці захапіўся й камуністычнай ідэяй, наіўна веручы, што толькі камунізм здольны правільна разьвязаць і беларускую нацыянальную праблему. Дык нічога дзіўнага, што сутыкнуўшыся лоб у лоб з камунізмам у БССР, мусіў горка расчаравацца, што й сталася прычынай ягонага трагічнага лёсу.

У пачатку дваццатых гадоў старэйшыя вучні Віленскай Беларускай Гімназіі выдавалі свой друкаваны часапіс «Маладое Жыцьцё». Захопленым іхным прыкладам, і нам малодшым вучням задумалася мець свой часапіс. І вось з маей ініцыятывы й пры маім рэдагаваньні восеняй 1922 году, калі мы жылі супольна ў вучнёўскім інтэрнаце пры Філярэцкай вул. № 12, і выйшаў на шапіраграфе першы нумар нашага часапісу «Зорка», які быў вельмі прыхільна спатканы ня толькі вучнёўскай моладзяй, але й настаўнікамі гімназіі. У гэтым нумары «Зоркі» паявіліся й першыя вершы Алеся Салагуба. Адна строфка зь іх асталася ў маей памяці й да сяньня:

Даволі песьні пець чужыя.
Давайце будзем пець свае!
У нашых песьнях славы жывыя:
Яны вядуць нас к барацьбе.

Гэта й быў першы «друкаваны» выступ пачынаючага паэты.

Змучаны частымі арыштамі й турмою «Лукішкамі» ды будучы глыбака ўвераным, што ў БССР узапраўды будуецца «беларускі нацыянальны дом» (гэтак тады гаварылася ў Вільні пра БССР), Салагуб, як і многія зь беларускай вучнёўскай моладзі, у 1928 годзе перабраўся нелегальна ў Менск. Пасьля нейкага часу ў Вільні пашырылася вестка, што Салагуб арыштаваны й расстрэлены ў падвалах менскае турмы. Падчас нямецкае акупацыі, калі з Заходняй Беларусі адкрыўся свабодны доступ у Менск і навязаліся кантакты зь менскімі Беларусамі, гэтая вестка пацьвердзілася.

Надрукаваньне ў «Літаратуры і Мастацтве» некалькі вершаў гэтых двух паэтаў разам зь біяграфічнымі аб іх зацемкамі абазначае, што і Жылка і Салагуб напасьледак дачакаліся сваей чаргі быць «рэгабілітаванымі», хоць і на некалькі год пазьней пасьля «рэгабілітацыі» ў 1956-57 гг. пару дзесяткаў іншых беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў, якія ў свой час былі арыштаваныя, фізычна зьнішчаныя або памерлі ў высылцы. І толькі нямногія зь іх дачакаліся сваей «рэгабілітацыі» жывымі й вярнуліся ў Беларусь. Але ўсе яны былі «рэгабілітаваныя» адно часткава, бо далёка ня ўсе, а толькі некаторыя іх творы, напісаныя перад іхным арыштам, перадрукоўваюцца цяпер у савецкай Беларусі. Над іншымі-ж творамі вісіць і сяньня забарона савецкае цэнзуры. Дык напэўна і Жылкаў «Тэстамант» і лірычная ягоная паэмка «Уяўленьне», якая ў сваім менскім выданьні яшчэ перад бальшавіцкім наступам супраць беларускай нацыянальнай культуры, у 1927 годзе была выйшла бязьлітасна парэзанай і перакручанай савецкай цэнзурай, не пабачыць цяпер сьвету, як не пабачаць яго й многія вершы Салагуба.

XXII зьезд камуністычнай партыі Савецкага Саюзу на прапанову самога Хрушчова яшчэ раз асудзіў Сталіна за ягонае фізычнае вынішчэньне мільёнаў нявінных людзей. Той-жа Хрушчоў падаў на партыйным зьезьдзе праект паставіць памятнік ахвярам Сталінскага тэрору. Але ўспомненыя біяграфічныя зацемкі

(Заканчэньне на 3-яй бачыне)

Сталінізм 30-х гадоў у Беларусі

(Працяг з папярэдніх нумароў)

У часе патрому беларускае культуры на пачатку 30-ых гадоў строгаму перагляду быў падпадзены рэпэртуар тэатру, асабліва Першага Беларускага Тэатру. Усё, што хоць крыху нагадвала нацыянальнае беларускае, выганялася із сцэны, не зважаючы на мастацкую вартасьць. Дабраліся і да Вандроўнага тэатру, якім кіраваў народны артысты Уладыслаў Галубок. Заміж блізкіх і зразумелых шырокім сялянскім і работніцкім масам драмаў з жыцьця народу, тэатру былі накінутыя чужыя і незразумелыя перакладныя п'есы. Рэпэртуар Тэатру быў узяты пад суровы нагляд. Перагледжаны быў таксама рэпэртуар ансамбляў народнае песьні і музыкі. Загадчык аддзелу мастацтва ў Народным Камісарыяце Асьветы Ільля Гурскі ў гэтым дачыненьні выявіў асаблівую «пільнасьць». Ён бачыў нацдэмаўшчыну ня толькі ў тэатральных п'есах, але ў вопратцы артыстых. Артыстыя беларускага народнага ансамблю песьні і музыкі звычайна выступалі на сцэне ў нацыянальных касьцюмах: вышываных сарочках і белых штанох. Гурскі загадаў замяніць белыя штаны на чорныя, а вышываныя сарочкі чымсьці паводля пінджакоў, толькі безь беларускіх арнамэнтаў. З франтону будынку Першага Беларускага Тэатру былі зьнятыя бюсты народных паэтаў: Янкі Купалы, што спрабаваў скончыць жыцьцё самагубствам, і Якуба Коласа.

Беларусы заўсёды ганарыліся сваім вялікім прашчурам, полацкім вучоным, доктарам і першадрукаром Беларусі — Францішкам Скарынам. Да 1930 году вывучэньню жыцьця й дзейнасьці Скарыны было пасьвячана мноства працаў і дасьледаваньняў. Ягоныя патрэты былі выпушчаныя вялікім тыражом і ўпрыгожвалі залі навуковых і культурных установаў, школаў, музэяў і гэтак далей. Вялікая гіпсавая фігура Скарыны была пастаўленая ў вэстыбюлі Інстытуту Беларускае Культуры, а затым, у 1928 годзе, была перанесеная ў Акадэмію Навук. У часе разгрому нацдэмаўшчыны статуя вучонага доктара XVI стагодзьдзя была выкінутая таксама. Былі зьнішчаныя таксама і малыя статуэткі Скарыны. Гэткая-ж доля спаткала патрэты і статуэткі народнага героя, правадыра беларускіх паўстанцаў Кастуся Каліноўскага.

Каб канчальна скампраміваць нацдэмаў і іхную дзейнасьць, новы загадчык аддзелу мастацтва Наркамасьветы БССР Ільля Гурскі атрымаў заказ напісаць адпаведную п'есу. Гурскі пастанавіў сам узяцца за гэтае заданьне, каб стварыць сабе кар'еру. Не валодаючы здольнасьцямі драматурга, ён напісаў ня п'есу, а бяздарны пашквіль на людзей, што апынуліся ў падвалах ГПУ. Выкарыстаўшы сваё службовае становішча, Гурскі забавязаў Першы тэатр зрабіць паказ свае няўдалае п'есы. У ход былі пушчаныя вялізарныя матарыяльныя рэсурсы на шкоду іншым тэатрам, каб як-небудзь паставіць антынацдэмаўскую п'есу. Аднак, ні матарыяльныя затраты, ні намаганьні рэжысуры ня здолелі хоць крышачку памагчы п'есе. Гурскі прадставіў нацыянальных дзеячоў Беларусі п'яніцамі і здэмаралізаваным элемэнтам. Спроба самагубства Янкі Купалы была паказаная як бязглузды ўчынак у п'яным стане.

Па двух-трох паказах п'еса Гурскага, як выразна бяздарная, надуманая і хвальшывая, без асаблівага галасу, крытыкі, каяньня і прызнаньня памылак аўтара была зьнятая з тэатральнай сцэны. Спроба выкарыстаць тэатр для цкаваньня нацдэмаў пакуль што праваліласа.

(Працяг будзе)

Азнакі нацыі адміраюць...

(Заканчэньне зь 1-ай бач.)

стычных» нацыяў, бо «з чатырох абавязковых асаблівасьцяў нацыі Сталіна засталася толькі адна» (мова), а падсавецкія нацыі й надалей «працягваюць сваё існаваньне». Аднак для нас у дадзеным выпадку ня вельмі важна, у якім кірунку будзе зроблены гэты перагляд. Важна тое, што падсавецкія нацыі прадаўжаюць існаваць, не зважаючы на ўсялякія экспэрымэнты зь імі й тое ці іншае савецка-расейскае крэдо.

Бязумоўна, доўгае палітычнае й маральна-культурнае паняволеньне заўсёды адмоўна адбіваецца на жыцьці й жыцьцяздольнасьці тае ці іншае нацыі. Аднак нацыя вельмі жывучая, і калі тарнуецца да яе палітыка гвалтоўнай дэнацыяналізацыі — перасяленьне, зьмешваньне народаў і пагалоўная асыміляцыя, — дык нацыя можа стагодзьдзямі перахаваць сама сябе у гэтым палітычным і маральна-культурным паняволеньні. Гэтую асаблівасьць нацыі ўжо ад нейкага часу падсьцераглі маскоўскія сатрапы, а таму цяпер Масква прыступае да палітыкі як моўнае, так і наагул поўнае нацыянальнае асыміляцыі нерасейскіх народаў. У новай праграме партыі, як ведама, запісана, што ў далейшым будзе праводзіцца палітыка абмену нацыянальнымі кадрамі ці палітыка навадненьня расейскім кіраўнічым і культурным элемэнтам нацыянальных рэспублікаў СССР. Праводзіцца, і як зазначыў на XXII зьезьдзе КПСС Хрушчоў, яшчэ ў большых маштабах будзе праводзіцца палітыка перасяленьня ці зьмяшаньня падсавецкіх народаў. Гэта — найбольш страшнае для жыцьця нацыяў.

Пра цяперашнія падсавецкія «сацыялістычныя» нацыі й пра адменныя для іх азначаньні, ведама, ня прыходзіцца гаварыць. Іхнае цяперашняе нацыянальнае жыцьцё зьяўляецца нічым іншым, як перажываньнем цёмнага часу іхнае гісторыі й гэта як у дзяржаўна-палітычнай, так культурнай і эканамічнай дзялянцы. З гэтага «савецкага» ці «сацыялістычнага» наносу не застанецца нічога пасьля іхнага вызваленьня. Прыпыненае з ростам дрэва пры сваім новым развоі не становіцца грунтоўна іншым. Яно пускае тыя самыя галіны й лісьцё, што й раней, толькі або менш ці больш пышныя, часамі з тэй ці іншай іржаўчынай, як азнака ранейшае зьнямогі.

П. Урбан

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Пятру Сычу – 50 год

18-га студзеня беларуская калёнія ў Мюнхэне адзначыла 50-цігадовы юбілей беларускага пісьменьніка й журналіста-га на эміграцыі Пётра Сыча.

Жыцьцёвы шлях юбіляра ня быў лёгкім. Пётра Сыч нарадзіўся ў вёсцы Батурына, Вялейскага павету, у беднай сялянскай сям'і. Пачатковую школу скончыў у роднай вёсцы й сямікласную — у вёсцы Хаценчыцы. У 1929 годзе закончыў гімназію ў Вялейцы. У 1930 годзе запісаўся на Віленскі ўнівэрсытэт на аддзел філязофіі, аднак пасьля двух год мусіў пакінуць унівэрсытэт з прычыны хваробы маці-ўдавы. Давялося стацца ўрадоўцам, каб зарабляць на жыцьцё. У той-жа час стаўся супрацоўнікам віленскіх польскіх газэтаў.

Адначасова з публіцыстыкай, Пятро Сыч пачаў і пісьменьніцкую дзейнасьць. Ягоны першы верш — папольску — быў надрукаваны ў 1932-м годзе ў віленскай газэце «Глос Люду». Як пад артыкуламі, так і пад мастацкімі творамі спачатку падпісваўся псэўдонімам Петрэк Вілейскі, а пазьней — і да гэтага часу — сваім запраўдным прозьвішчам або псэўдонімам **пс.**

Пад польскай акупацыяй Пятро Сыч быў асабіста знаёмы з такімі беларускімі дзеячамі як Рак-Міхайлоўскі, Тарашкевіч і іншыя.

У 1939 годзе Пётра Сыч быў змабілізаваны ў польскую армію і захоплены ў палон бальшавікамі ў Ашмянах. Аднак з палону яму ўдалося ўцячы.

3-га кастрычніка таго-ж 1939-га году П. Сыч быў арыштаваны. Спачатку сядзеў у вялейскай турме. «Сацыялістычную законнасьць» П. Сыч пазнаў хутка: пры допытах яму выбілі ўсе зубы... (глядзі альманах «Ля чужых берагоў»; П. Сыч — «14 калядаў на чужыне»).

У чэрвені 1940-га году П. Сыча перавезьлі ў полацкую турму. Там яму — бяз суду — прачыталі прысуд: 10 гадоў канцлягеру паводля 58-га артыкулу. Галоўная падстава — антыкамуністычныя артыкулы ў прэсе.

У верасьні 1940-га году П. Сыч быў вывезены ў Комі АССР, у «Севжэльдорлаг», дзе і прабыў да канца верасьня

1941-га году. Адтуль, на падставе ўмовы «Сікорскі—Майскі» як польскі грамадзянін быў перакінуты спачатку ў Надволжа, а пазьней у Самарканд, дзе тварылася польская армія.

Адтуль праз Пэрсію, Ірак, Сырыю, Лібан, Палестыну, Эгіпет — у лютым 1944-га году П. Сыч разам з корпусам Андэрса, у ранзе паручніка, быў перакінуты на фронт у Італію, дзе браў удзел у баёх пад Монтэ Касыно, Анконай і Балёніяй. За ўвесь час свае вайсковае службы П. Сыч быў паранены 4 разы.

Пасьля заканчэньня вайны корпус Андэрса быў перавезены ў Ангельшчыну. П. Сыч прыбыў туды ў ліпені 1946-га году. Пад уплывам ведамага грамадзкага і палітычнага дзеяча Вінцука Жук-Грышкевіча, зь якім юбіляр пазнаёміўся і пасябраваў у полацкай турме ды прайшоў разам цярністы шлях аж да Ангельшчыны, Пётра Сыч актыўна ўлучыўся ў беларускую журналістычную, грамадзкую і палітычную дзейнасьць.

У 1951-м годзе П. Сыч пераехаў у Нямеччыну, дзе зьяўляўся галоўным рэдактарам сатырычнага часапісу «Шарсьцень» і — да гэтага часу — сталым супрацоўнікам нашай «Бацькаўшчыны».

Ад 1954-га году — адным зь першых — Пётра Сыч стаўся супрацоўнікам Беларускае Рэдакцыі Радыя Свабода.

Сто год юбіляру!

Ул. Немановіч

Балтыйска-Чарнаморскі водны шлях

Агінскі канал быў пабудаваны яшчэ ў канцы 18 стагодзьдзя. Гэты канал праз Шчару, прыток Нёману, і праз Ясёлду, прыток Прыпяці, зьвязваў Прыпяць зь Нёманам. Працягласьць гэтага каналу была 55 кілямэтраў, а глыбіня ня перавышала аднаго мэтра. Канал прызначаўся пераважна для сплаву лесу на плытох, які ў вялікай колькасьці розных асартымэнтаў нарыхтоўваўся ў пушчах Палесься. Але штучна створаная мяжа паміж Усходняй і Заходняй Беларусяй адмоўна адбілася на эксплятацыі гэтага каналу. Пасьля дваццатых гадоў Агінскі канал згубіў гаспадарскую важнасьць для паўдзённа-заходняй часьці нашага краю. Пакінуты бяз догляду, канал паступова разбураўся.

Вось-жа апошнімі часамі ў савецкай прэсе падаюцца весткі, што плянуючыя арганізацыі складаюць праекты стварэньня воднага шляху Нёман—Прыпяць—Дняпро. Гэты шлях, працягласьцю 2500 кілямэтраў, мае зьвязаць Балтыйскае мора ад Клайпэды з Чорным морам да гораду Херсону. Водная траса перасякала-б Летуву й Калінінградзкую вобласьць РСФСР (часьць тэрыторыі былай Усходняй Прусіі) працягласьцяй 550 клм., Беларусь працягласьцяй 810 клм. і Украіну працягласьцяй 1 400 клм.

Праект прадбачыць зьвязаць Нёман з Прыпяцьцю глыбокаводным каналам, які зможа прапускаць караблі зь цяжарам да пяці тысяч тонаў. Глыбіня ня толькі каналу, але й усяго воднага шляху ў навігацыйныя часы павінна быць ня менш 3,65 мэтраў. Водны шлях мае праходзіць па Прыпяці да ўплыву ў яе прытоку Ясёлды блізка Пінска. Далей шлях пойдзе па Ясёлдзе або навет уздоўж яе каля Бярозаўскай электрастанцыі. Далей мае быць праложаны новы канал працягласьцяй звыш 70 клм., які перарэжа вадападзел паміж прытокамі Нёману й Прыпяці, пройдзе па рэчках Грыўда і Шчара й нейдзе каля пасёлку Масты злучыцца зь Нёманам.

Гэты вялізарны водны шлях, які мае прайсьці праз Палескую нізіну, паводля запраектаванай схэмы мае разьвязаць праблему й асушэньня Палескай нізіны. У мясцовасьцях каштоўных земляў для сельскай гаспадаркі пры правядзеньні мэльярацыйных працаў будуць будавацца спэцыяльныя дамбы, каб адвесьці ў час паводак лішнюю ваду на мэльяраваных зямельных прасторах. Найважнейшым заданьнем у гэтых працах, калі яны ўзапраўды будуць рэалізавацца, будзе карэннае рэгуляваньне вялізарных водных рэсурсаў у Палескай нізіне й значнае зьмяншэньне затопленых прастораў, якія ляжаць блізка воднага шляху. Для гэтага маюць будавацца вадасховы на 4-5 мільярдаў кубамэтраў вады.

Адначасна із спускам вады з Палескай нізіны праектамі прадбачыцца пабудаваць ня менш 10-12 запрудаў дзеля пропуску караблёў. Для гэтай мэты толькі на тэрыторыі Беларусі мяркуецца затапіць звыш 100 тысячаў гэктараў зямлі.

На Украіне будаўніцтва воднага шляху ўжо вядзецца і не патрабуе шмат часу й працы. Тут асталося закончыць будаўніцтва Кіеўскай і Канеўскай гідраэлектрастанцыяў на Дняпры. Сёе-тое зроблена й на тэрыторыі Летувы. Ужо здадзеная ў эксплятацыю Каўнаская электрастанцыя, якая зьяўляецца пачаткам будаўніцтва воднага шляху на Нёмане. Запраектавана таксама будаўніцтва Бірштанскай і іншых гідраэлектрастанцыяў, якія будуць абслугоўваць водную трасу.

Больш складаныя працы прадбачацца на тэрыторыі Беларусі. Пакуль што тут вядуцца пошукі прыгодных эканамічных варыянтаў розных працаў. У справе скарыстаньня земляў Палескай нізіны існуюць толькі розныя меркаваньні без канкрэтных плянаў. З асушэньнем і правядзеньнем мэльярацыйных працаў у Палескай нізіне значнае месца адводзіцца працам над паглыбленьнем і выпраставаньнем рэчышча Прыпяці, каб даць сьцёк лішнім водам і абмежаваць вялізарныя разьлівы вясною, якімі звычайна заліваюцца на доўгі час значныя зямельныя прасторы.

Калі-б узапраўды быў пабудаваны Балтыйска-Чарнаморскі водны шлях, была-б разьвязаная й адвечная праблема асушэньня Палескай нізіны. Але пакуль што разважаньні аб стварэньні глыбокаводнага шляху зьяўляюцца толькі прапагандай аб будучых вялікіх будоўлях камунізму й матарыялам для накідак дваццацігадовага пляну будаўніцтва ў Савецкім Саюзе. Пабудаваныя на Украіне й Летуве гідраэлектрастанцыі былі запланаванымі сямігадовым плянам і толькі можа ў будучыні будуць уключаныя ў камплекс будоўляў для новага воднага шляху. На тэрыторыі Беларусі яшчэ нічога ня зроблена. Можа здарыцца й так, што будаўніцтва каналу й асушэньне Палескай нізіны ня будзе ўключана ў першачарговыя працы. Можа стацца й так, як было з плянамі асушэньня балатоў на Палесьсі. Ажыцьцяўленьне мэльярацыйных працаў уносілася ў пляны пяцігодак і нарэшце ў пляны сямігодкі, аднак да кардынальных працаў так і ня прыступлена да гэтага часу. Вось-жа з гэтых прычынаў апублікаваныя ў савецкай прэсе матарыялы аб будаўніцтве Балтыйска-Чарнаморскага воднага шляху зьяўляюцца праблематычнымі.

В. К.

Адказ акадэміку Хацкевічу

Адказ на мой ліст савецкага акадэміка А. Хацкевіча ў 58-м нумары «Голасу Радзімы» (ліпень 1961 г.) поўны хвальшу, перакручваньняў, недаказваньняў, хлусьні ды абвінавачаньняў зусім няпрычынных асобаў, каб як-небудзь прыкрыць запраўдных злачынцаў рабаваньня беларускіх этнаграфічных прастораў і нішчэньня на працягу 43-х год міліёнаў Беларусаў. Няма дзіва, што такая аблыжнасьць Хацкевіча абурыла беларускую эміграцыю. Я шчыра дзякую сп. сп. Залужнаму й Волацічу, што яны мяне падтрымалі, адказваючы А. Хацкевічу ў «Бацькаўшчыне» (№№ 38-39 і 40).

А. Хацкевіч у вадказе на мой ліст выявіў ува ўсёй галізьне маральную мізэру чалавека, узгадаванага паводля камуністычнага дурману, у якога партбілет выцісьнуў усе якасьці чалавека культурнага, сумленнага, справядлівага. Хацкевіч з усіх сілаў намагаецца даводзіць мне пра бяспраўе беларускага народу за царскіх часоў. Але ўсё гэта мне добра ведама, бо 65 гадоў таму, калі я пачаў хадзіць у школу, і ў далейшыя гады, я й мае аднаклясьнікі разумелі, што мы вучымся не ў сваёй роднай мове, а ў мове нашых ворагаў, якія адабралі ад нашага народу волю й права на самастойнае жыцьцё. Ня гледзячы на царскі прыгнёт, у тыя даўныя часы ўва ўсіх школьных падручніках можна было знайсьці, калі не ў радкох, то між імі, пра нашую Бацькаўшчыну Вялікае Княства Літоўскае (Беларусь) і ейных слаўных сыноў, што бескарысна йшлі прасьвятляць паўдзікую Маскоўшчыну. А як і чаго вучаць камуністычныя школы ў «найсвабоднейшай» БССР — найлепш адказвае сам Хацкевіч. Акадэмік гэты цешыцца, што ў Саветах няма межаў, і беларускі народ вельмі задаволены з гэтага, бо ўсе грамадзяне ў камуністычным «раі» раўнапраўныя. Трэба дзівіцца, што гісторык Хацкевіч ня хоча бачыць у беларускай сталіцы Менску толькі 1/10 беларускіх школаў, а 9/10 расейскіх; ня хоча прызнаць, што ў дзяржаўных установах трэба гутарыць толькі парасейску, што бадай усе вуліцы названыя імёнамі Расейцаў, па ўсёй Беларусі шыльды ў расейскай мове, бальшыня саўгасаў і калгасаў названыя імёнамі сваіх прыгнятальнікаў. Чаму-ж пры такой раўнапраўнасьці, на абшарах Вялікарасеі, дзе жывуць міліёны Беларусаў, няма аніводнае беларускае школы? Усяму сьвету ведамая камуністычная «раўнапраўнасьць», якою распараджаюцца вылучна Расейцы ды тыя, што прадаліся ім. У «найсвабаднейшай» Беларусі мой ліст быў надрукаваны толькі ў «Голасе Радзімы», што не распаўсюджваецца ў БССР, а прызначаны вылучна на экспарт. Чаму якая-небудзь іншая беларуская газэта ці часапіс не надрукавалі яго, як гэта робіцца ў заходніх краёх? Няхай-бы браты й сёстры на Бацькаўшчыне даведаліся, што ёсьць на сьвеце людзі, якія прыпамінаюць цывілізаванаму сьвету й барбарам дваццатага стагодзьдзя аб народагубнай палітыцы ў дачыненьні да беларускага народу.

Хацкевіч кажа мне: «Цяпер вам, наш чытач А. Санежка, і іншым эмігрантам, думаецца, (ведае, што яму не паверацъ!) будзе зразумелым, куды дзяваліся бела-

(Заканчэньне на 4-ай бачыне)

Гэтак выглядаюць савецкія „рэгабілітацыі"

(Заканчэньне з 2-ой бач.)

аб Жылцы й Салагубу старанна прамоўчваюць якраз тое, што абодвы паэты й былі ахвярамі Сталінскага тэрору. Чаго-ж тады саромецца або баяцца сказаць цяпер прынамся гэтую горкую праўду аб Жылку й Салагубу пасьля таго, калі партыйны зьезд якраз за гэта афіцыйна закляйміў Сталіна й выкінуў ягоную мумію з крэмлёўскага маўзалею? Адказ на гэтае пытаньне напрошваецца адзін: на партыйным зьезьдзе быў Сталін агульна абвінавачаны ў злачынствах адно дзеля прапаганды як унутры Савецкага Саюзу, гэтак і навонкі, каб абяліць камуністычную сыстэму, як такую, зваліўшы ўсю віну за злачынствы гэтае сыстэмы на аднаго няжывога Сталіна. Затое ў паасобных выпадках, як у дадзеным выпадку ў дачыненьні да Жылкі й Салагуба, гэтыя злачынствы й далей прамоўчваюцца, бо ў кажным канкрэтным выпадку іх нельга аддзяліць ад цэлай камуністычнай сыстэмы.

Ст. Крышыніч

Ф. Кушаль

Польская палітыка на Беларусі ў часе Польска-Бальшавіцкае вайны 1919-20 г.

(Працяг з папярэднага нумару)

Гэткім чынам, пагадзіўшыся на прыгаданы Тытусам Камарніцкім кампраміс, Пілсудзкі адмаўляўся фактычна ад фэдэрацыйнае палітыкі, прынамся ў дачыненьні да Беларусі, бо, калі-б «кампрамісная» мяжа запраўды заіснавала, яна сягала-б, праўда, значна далей на ўсход, чымся ўсходняя мяжа, усталеная Рыскім мірным трактатам, але ўсё-ж дзяліла-б Беларусь больш-менш напалам, тады як мяжа 1772 г. йшла на захад ад Смаленску й далей на поўдзень па Дняпры й Сожы. У выніку кампрамісу, затое, выйгравала Эндэцыя, якая не хацела задалёка пасуненых на ўсход межаў. Гэтак, галоўны ідэалёг польскае эндэцыі праф. Львоўскага ўнівэрсытэту Станіслаў Грабскі пераконваў сваіх выхаванкаў-студэнтаў, што польская, не фэдэрацыйная, а **польская** мяжа на ўсходзе павінна сягаць там, дзе поўная палянізацыя жыхарства можа быць праведзеная на працягу якіх 15-20 год.

Інтэрнаваньне старшыні Рады Міністраў БНР Антона Луцкевіча

Калі, пасьля канца Другое Сусьветнае вайны, у Вэрсалі пачаліся мірныя перамовы, Рада БНР зараз-жа дэлегавала ў Вэрсаль сваё прадстаўніцтва ачоленае старшынём Ураду БНР Антонам Луцкевічам. Прыбыўшы на Вэрсальскую канфэрэнцыю, Антон Луцкевіч пачаў у Парыжы сустрэчы й гутаркі з найвыдатнейшымі дыпляматамі, што бралі ўдзел у канфэрэнцыі, між іншых, і з тагачасным прэзыдэнтам ЗША Вудро Вільсанам. Луцкевіч намагаўся азнаёміць гэтых дыпляматаў, што, фактычна, трымалі ў руках лёс усіх народаў Эўропы, зь беларускай справай, называючы рэчы іхнымі запраўднымі ймёнамі. Польскую армію, што пераможна маршыравала тады праз Беларусь, ён прадстаўляў, як часовых польскіх акупантаў, якія йшлі на замену акупантаў чырвоных, дарма, што польская дыпляматыя прадстаўляла справу беларуска-польскіх дачыненьняў зусім накш, чымся Луцкевіч. Накш, чымся Палякі, тлумачыў ён і шмат якія іншыя тагачасныя падзеі на Беларусі. Нарэшце, прэзыдыюм канфэрэнцыі запрапанаваў Луцкевічу паразумецца беспасярэдня з польскім урадам і заладзіць справы зь ім. Калі-ж гэта яму-б не ўдалося, тады яму прыраклі паставіць справу на абмеркаваньне канфэрэнцыі. Польская дэлегацыя на Вэрсальскай канфэрэнцыі запрапанавала з свайго боку Луцкевічу паехаць у Варшаву й дамовіцца там самперш па ўсіх пунктах з польскім урадам. Луцкевіч прыняў гэтую апошнюю прапанову з найлепшай вераю і ў верасьні 1919 г. выехаў з Парыжу ў Варшаву. У Варшаве, аднак, справа зь месца затрымалася на мёртвым пункце. Польскі ўрад ніякіх гутарак з Луцкевічам не пачынаў, адкладаючы іх усьцяж на пасьлей. Нарэшце, Луцкевіч пераканаўся ў няшчырасьці й нежаданьні ўраду гутарыць зь ім наагул і наважыў вяртацца ў Парыж. Але тут чакала яго прыкрая неспадзеўка: польскае міністэрства замежных справаў адмовіла яму ў выязной візе з Польшчы і, гэткім чынам, Луцкевіч быў фактычна інтэрнаваны ў Польшчы і ў Вэрсаль вярнуцца ня мог.

Паход на Украіну

Накш разгортваліся польска-украінскія дачыненьні. Польскі ўрад прызнаў дэ-юрэ Украінскую Народную Рэспубліку, як сувэрэнную дзяржаву й 21-га красавіка 1920 г. падпісаў з урадам УНР палітычна-вайсковы саюз. А 26-га красавіка 1920 г. пачаўся супольны паход польска-украінскае арміі супроць чырвонае арміі на Украіне. 7-га травеня 1920 г. украінская армія здабыла Кіеў, а 8-га травеня ў Кіеў увайшла й польская армія. Савецкае галоўнае камандваньне сьцягнула на Украіну вялікія вайсковыя спалучэньні й пачало ў пачатках чырвеня вайсковыя апэрацыі супроць польска-украінскіх саюзьнікаў, якія, прабыўшы ў Кіеве месяц, мусілі ў пасьпеху адступіць. Гэткім чынам, першае адкрытае выпрабаваньне фэдэрацыйнае палітыкі Пілсудзкага цалкам праваліласа й гэты факт стаўся пераломным момантам у паглядах Пілсудзкага, што да ягонае ўсходняе палітыкі (Станіслаў Сьвяневіч, «Незрэалізаваныя пляны Пілсудзкага», месячнік «Культура», май 1960, № 5 (151). Польская эндэцыя адразу-ж выкарыстала украінскую няўдачу, як нагоду да ўзмоцненых нападаў на Пілсудзкага. У эндэцкай прэсе Пілсудзкага пачалі называць авантурнікам, а ягоную ўсходнюю палітыку загубнай для Польшчы.

Наступ чырвонае арміі на Беларусі

Пасьля перамогі на Украіне ў чырвені 1920 г., бальшавіцкае галоўнае камандваньне пачало 4-га ліпеня таго-ж году наступ і на Беларусі. Пасьля зацятых баёў над Бярэзінай, польская армія пачала адступаць на Захад, а 11-га ліпеня Палякі пакінулі Менск. Адступаючы на захад, польскае галоўнае камандваньне спадзявалася арганізаваць абарону на лініі былых нямецкіх пазыцыяў, аднак, гэта яму не ўдалося з тае прычыны, што, як піша Побуг-Маліноўскі, польская армія адступала хаатычна, паасобнымі, не зьвязанымі міжсобку групамі, няздольнымі ўстрымаць напор савецкіх войскаў. Да таго-ж, пачало наступ на левы флянг і тыл польскае арміі таксама й летувіскае войска, за што бальшавіцкі ўрад дазволіў Летувісам заняць Вільню.

Маршал Тугачэўскі фарсаваным маршам кіраваўся на Варшаву. Польшча апынулася ў нязвычайна цяжкім палажэньні. Урад абвесьціў агульную мабілізацыю ўсіх мужчынаў, што маглі трымаць у руках стрэльбу ці лапату. У вабліччы вялізарнае небясьпекі, маючы ворага блізу пад мурамі Варшавы, польскі народ перажыў нязвычайны патрыятычны ўздым, якога Палякі ня ведалі, хіба, ніколі на працягу ўсяе гісторыі. 15-га жнівеня 1920 г. польская армія выканала ўдалы манэўр на левае крыло чырвонай арміі з раёну Дэмбліну. Чырвоная армія заламалася й пачала адступаць. Яна спрабавала затрымацца на Нёмне, але была разьбітая й тут і у канцы жнівеня, польскія кавалерыйскія аддзелы ўзноў увайшлі, на кароткі праўда час, у Менск. Сваю перамогу над бальшавікамі пад Варшаваю палякі назвалі «цудам над Віслай». Гэткі-ж цуд мог стацца й над Дняпром, бо ўсё залежыць ад паставы народу.

(Заканчэньне будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Зь беларускага жыцьця

УДЗЕЛ БЕЛАРУСАЎ У КАЛЯДНЫМ ФЭСТЫВАЛІ Ў ЛЁС АНДЖЭЛЕС

Міжнацыянальны калядны фэстываль Гарадзкога Аддзелу Мастацтва ў Лёс Анджэлес адбыўся ў часе ад 7-га да 17-га сьнежня 1961 году ў Гарадзкой Галярэі Мастацтва ў Барнсдал Парку. У гэтай штогодняй імпрэзе сёлета бралі ўдзел 24 нацыянальныя групы. Галоўнай мэтай кажнай групы было паказаць, як сьвяткуюць Каляды ў краіне, якую яны прадстаўляюць. Дзеля гэтага была дадзена магчымасьць убраць ялінку з выстаўкай народнага мастацтва й выступіць з калядпай праграмай на сцэне пад адкрытым небам. Пакоі для выставак прыдзяляліся шляхам лясаваньня. Беларусы выцягнулі 6-ы нумар, які азначаў пакойчык насупраць галоўнага ўваходу й тым самым быў аб'ектам першае ўвагі наведвальнікаў.

Беларуская ялінка й калядная выстаўка былі наладжаны супольнымі сіламі мясцовага аддзелу БАЗА й БККА. На ялінцы былі новыя цацкі, як каляровыя ланцужкі, кошычкі, шышкі й інш., а пад ёю была засланая дзяружка. На галоўнай сьцяне на дзяружцы вісеў абраз Маці Божай Астрабрамскай, упрыгожаны вышываным ручніком. На правай сьцяне былі вышыўкі — адна зь іх зь беларускімі васількамі. На іхным фоне вісела Пагоня. Зьлева на сьцяне на дзяружцы былі разьвешаны: здымак Вільні, патрэт Янкі Купалы й патрэт групы беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў. Пад імі стаяў мадэль беларускай хаты з вобразамі беларускіх Каляд у выкананьні сп. В. Клока. З правага боку ўздоўж сьцяны стаяла лаўка, засланая дзяружкай, а на ёй разложаныя вышываныя падушкі, паміж якімі знаходзілася вялікая лялька ў прыгожай нацыянальнай вопратцы. Па бакох стаялі на вышываных сарвэтках букет і шкатулкі, аздобленыя беларускімі арнамэнтамі з саломы. Пасярэдзіне паміж ялінкай і лаўкай пад абразом стаяў стол, засланы вышываным настольнікам, на якім пасуда сымбалізавала вячэру на Куцьцю. Карты Беларусі й апісаньне беларускіх калядных звычаяў з агульнымі інфармацыямі аб Беларусі аблягчалі наведвальнікам знаёміцца з нашай краінай.

Першы дзень выстаўкі, 7-га сьнежня да абеду быў прысьвечаны прэсе, радыю й тэлевізіі. Усе прэсавыя фатографы ахвотна рабілі здымкі беларускіх дзетак у нацыянальнай вопратцы на фоне ялінкі й выстаўкі, а беларускіх прадстаўнікоў засыпвалі пытаньнямі аб Беларусі й беларускіх Калядах.

Вечарам таго самага дня аглядалі выстаўку мэр гораду Ёрты із сваімі гасьцямі, сябрамі кансулярнага корпусу. Падчас гэтага аркестра грала калядныя мэлёдыі.

Беларуская праграма адбылася ў нядзелю 17-га сьнежня а 8-ай гадз. вечарам. Спачатку сп. К. Вайцяхоўскі інфармаваў у ангельскай мове прысутных аб Беларусі й ейных калядных звычаях. Пасьлей ён абвяшчаў і паясьняў паасобныя пункты праграмы. Сп. Ніна Гудзім-Леўковіч прыгожа прапяяла солё «Сьвецяць зорачкі». Дуэтам былі ўдала выкананыя сп. сп. Нінай Гудзім-Леўковіч і Лысенка «Ой на моры, моры» і «Я ад вас далёка». Акампаньяваў на піяніне сп. Ю. Каўцоў. Другая частка праграмы складалася з танцаў. Чатырохгадовая Ядзя Найдзюк у нацыянальным касьцюме зь беларускай лялькаю пратанцавала «Польку-Янку» пад акампаньямант на акардыёне сп. А. Мяленьцева. «Крыжачка» й «Лявоніху» праскакалі парамі сп. сп. І. Кананові́ч, К. Вайцяхоўскі, В. Стус, Ч. Найдзюк, Н. Мяленьцева, Я. Крот, С. Кананові́ч і В. Клок. Яскравасьць касьцюмаў, мілагучнасьць песьняў і жывасьць танцаў выклікалі бурныя воплескі.

Калядны фэстываль увесь час шырака рэклямаваўся ўсей галоўнай прэсай гораду Лёс Анджэлес, тэлевізіяй і радыям. У штодзеннай газэце «Гэральд Экспрэс» быў зьмешчаны фотаздымак фрагмэнту беларускай выстаўкі зь дзеткамі ў нацыянальнай вопратцы, каторым Іра Кананові́ч паказвае цацкі на ялінцы. Падобны абраз зь беларускай калядпай выстаўкі быў паказаны ў тэлевізіі на розных станцыях падчас перадаваньня вестак. Таксама па радыё была спэцыяльная перадача старшыні аддзелу БАЗА аб сьвяткаваньні Калядаў у Беларусі. У ятоным апрацаваньні быў раздаваны прадстаўніком прэсы інфармацыйны лісток аб Беларусі й беларускіх калядных звычаях.

Нязвычайная сёлетняя рэкляма калядпага фэстывалю нацыянальных групаў, а тым самым і беларускага імя зьяўляецца найлепшай узнагародай усім удзельнікам беларускай калядпай выстаўкі й праграмы ў гэтым фэстывалі.

Н.

СЯРОД БЕЛАРУСАЎ У ЧЫКАГО

У «Бацькаўшчыне» за 10-га сьнежня мінулага году была зьмешчаная карэспандэнцыя з Чыкаго, у якой успаміналася, што Беларусы прынялі ўдзел у Міжнацыянальнай выстаўцы ў Чыкаго 11-12 лістапада і што нехта мае падробна напісаць аб ёй у газэту. Да гэтага, аднак часу не паявілася ў «Бацькаўшчыне» дакладнага апісаньня ўспомненае выстаўкі, а шкода, бо наш беларускі аддзел на гэтай выстаўцы, мала таго, што быў шмат багацейшы, чымся ў мінулым годзе, але быў адзіным сярод іншых нацыянальных аддзелаў, у якім былі паказаныя ўзапраўды чыста нацыянальныя экспанаты. Можа ўспамінаць паводля прозьвішчаў усіх асоб, як з моладзі, гэтак із Згуртаваньня Беларусаў штату Ілінойс, што працавалі пры арганізацыі выстаўкі сяньня ўжо ня трэба. Але падзякаваць тым, што далі экспанаты або прычыніліся чымсьці іншым да арганізацыі выстаўкі, зьяўляецца неабходным.

Падчас гэтае зімы, пачынаючы із сьнежаня мінулага году, Беларусы пачалі часьцей ладзіць зборкі з рэфэратамі. У сьнежані ўжо адбыліся дзьве такія зборкі з рэфэратамі а. Янкі Тарасэвіча на філязафічную тэму «Чалавек» і сп. Часлава Будзькі на тэму зь беларускае гісторыі.

18-га сьнежаня была наладжаная разьвітальная зборка з а. Язэпам Гэрмановічам, які пакліканы ў Лёндан.

Дня 27-га сьнежаня была адслужаная вялікая паніхіда нашым духавенствам і хорам пад кіраўніцтвам праф. М. Куліковіча па апату Амброжым Ондраку, Чэху па нацыянальнасьці, які памёр 23-га сьнежаня. Нябожчык зьяўляўся вялікім прыяцелям Беларусаў і навет у многім дапамагаў нам матарыяльна.

31-га сьнежаня ў культурна-рэлігійным цэнтры была зладжаная супольная Куцьця й спатканьне Новага Году. Імпрэза пачалася малітваю, а пасьля яе вечарына з музыкаю й танцамі канчалася ўжо 1-га студзеня нараніцы.

Усе беларускія зборкі наагул ня сьвецяць пустатою, але на Куцьцю й спатканьне Новага Году сабралася столькі Беларусаў і нашых прыяцеляў спасярод Амэрыканцаў, што абедзьве залі культурна-рэлігійнага цэнтру былі, як кажуць, бітком набітыя. Перад Куцьцёю была зладжаная ялінка для дзяцей.

Блізу кажную нядзелю й сьвята, пасьля Божае Службы, праф. М. Куліковіч запрашае сьпевакоў царкоўнага хору ў залю культурна-грамадзкага цэнтру на рэпэтыцыі, а іншыя парахвіяне зьбіраюцца ў іншай залі й дзеляцца навінамі і ўражаньнямі.

Я. Асімовіч

ГАДАВІНА СЛУЦКАГА ПАЎСТАНЬНЯ Ў ПАРЫЖЫ

3-га сьнежаня 1961 году беларуская калёнія ў Парыжы ўрачыста адзначыла 41-ую гадавіну Слуцкага Паўстаньня. Урачыстую Акадэмію адкрыў старшыня Галоўнае Ўправы Аб'еднаньня Беларускіх Работнікаў у Францыі, перадаючы слова для дакладу прэзыдэнту Рады БНР сп. інж. М. Абрамчыку.

У сваей гарачай і зьмястоўнай прамове сп. Прэзыдэнт, прадставіўшы вялікае гістарычнае значаньне гэройскага чыну Случчакоў ды абагульніўшы супраціў беларускага народу камуністычнаму паняволеньню, больш падрабязна спыніўся на падзеі пратэстацыйнага самагубства ў Францыі беларускага падсавецкага пісьменьніка Ўсевалада Краўчанкі, якое зьяўляецца трагічным, але вымоўным довадам змаганьня Беларусаў з чырвона-расейскай тыраніяй.

Пасьля заканчэньня Акадэміі былі абгавораныя нутраныя арганізацыйныя пытаньні Аб'еднаньня, разгледжаныя пляны працы на будучыню ды сабраныя грошы на Фонд 25-га Сакавіка і ў касу Галоўнае Ўправы Аб'еднаньня.

А. К.

БЕЛАРУСКІЯ КАЛЯДЫ Ў МАНЧЭСТАРЫ

Управа манчэстарскага аддзелу Беларускага Праваслаўнага Брацтва й Сястрыцтва Жыровіцкае Божае Маці зладзіла супольнае сьвяткаваньне Калядаў. У суботу 6 сьнежаня 1961 г. а 3-яй гадзіне папаўдні ў Беларускім Доме адбылося прыняцьце для дзяцей з калядпай ёлкай і Дзедам Марозам. Кіраўніком дзіцячай імпрэзы была сп-ня Б. Рагель, якая вельмі добра прыбрала столікі зь ежай і частавала малых гасьцей. Пазьней зьявіўся Дзед Мароз (сп. Краўчук), які раздаў дзеткам падаркі, а яны ўзамен сьпявалі беларускія песьні й дэклямавалі вершы.

У нядзелю 7-га сьнежаня а 11-ай гадзіне у казацкай царкве а. З. Палякоў адправіў Багаслужбу й прывітаў беларускіх вернікаў з Раством Хрыстовым.

Пасьля Багаслужбы прыбылі на прыняцьце ў Беларускі Дом на запросіны ўправы Брацтва харыстыя з атаманам мясцовае казацкае станіцы палкоўнікам Каральковам. На просьбу дырэктара сярэдняе школы сп. Вэлша, хор пад дырыгенцтвам а. З. Палякова насьпяваў на магнэтафон шмат беларускіх і казацкіх песьняў.

Прыняцьце распачалося кароткім Малебенам, які адслужыў а. З. Палякоў. Старшыня мясцовага аддзелу Беларускага Праваслаўнага Брацтва (сп. М. Я-іч) прывітаў прысутных з калядпымі сьвятамі. Вечар быў праведзены ў мілай сяброўскай атмасфэры вельмі весела аж да позьняе ночы. Усім сябром і сяброўкам, што прычыніліся да ўдалага зарганізаваньня вечару, належыцца шчырае беларускае дзякуй.

М. Стаўпіскі

АДНОЎЛЕНАЕ ВЫДАНЬНЕ «БЕЛАРУСА»

Па колькігадовым перапынку, на дванаццатым годзе йснаваньня й на 71-м нумары, аднавілася выданьне Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў ЗША газэты «Беларус» (чародны нумар за лістапад 1961 г.). Да ведама чытачоў у газэце падаецца:

«Гэтым нумарам Галоўная Ўправа Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня адноўляе выдаваньне часапісу (?) БЕЛАРУС, як месячніка. Часапіс, неабходнасьць якога вельмі востра адчуваецца, мае быць адбіткам жыцьця, грамадзкіх патрэбаў і палітычнага становішча амэрыканскіх Беларусаў. Рэгулярны выхад і разьвіцьцё часапісу будзе залежаць ад маральнага й матар'яльнага падтрыманьня чытачоў, на што выдавецтва й лічыць».

«Беларус» рэдагуецца калегіяй. Цана паасобнага нумару 25 цэнтаў, гадавая падпіска зь перасылкаю — 4 даляры. Адрыс газэты:

401 Atlantic Ave, Brooklyn 17, N.Y., USA

Я. З.

УВАГА! УВАГА!

Ужо выйшла ў сьвет цікавая й цэнная кніга Канстанціна Акулы.



Кніга абыймае 586 бачынаў друку й каштуе: у Задзіночаных Штатах Амэрыкі й Канадзе — 7 даляраў, у Аўстраліі й Ангельшчыне — 2 фунты, іншых краінах — раўнавартасьць 6 амэрыканскіх даляраў.

Ужо можна заказваць гэтую кнігу ў самога Аўтара паводля наступнага адрысу: **Mr. Konstantin Akula, 57 Riverdale Ave, Toronto 6, Ont. Canada,** а таксама ў Адміністрацыі «Бацькаўшчыны» й ейных Прадстаўніцтвах.

Што зь сябе прадстаўляюць «Змагарныя Дарогі», чытач можа даведацца із зьмешчанага ў папярэднім нумары «Бацькаўшчыны» спэцыяльнага артыкулу.

ПОШУКІ

Шукаю брата Мікалая Вееўніка, сына Мікіты, зь вёскі Капашчэва. Весткі просіцца слаць на:

Mr. Thomas Weevnik
128 Blaine St.,
Passaic, N. J., U.S.A.

АСАБІСТАЕ

Украінец з Францыі, Іван Небулок, з мэтай сужэнства жадае пазнаёміцца з Украінкай ці Беларускай (дзяўчынай або жанчынай). Весткі просіцца слаць на:

Mr. Jean Nebulok
Bloc B Grand Giboulon,
Grand Charmont par Montbeliard,
(Doubs), France

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Беларускі тыднёвік палітыкі, культуры й грамадзкага жыцьця.
Выдавец: Уладзімер Бортнік
РЭДАГУЕ КАЛЕГІЯ
Артыкулы, падпісаныя прозьвішчам або ініцыяламі аўтара, не заўсёды выражаюць пагляды Рэдакцыі.

Сёе-тое

Надыйшла зіма і варта нам пацікавіцца, як цёпленька жывецца нашым суродзічам пад маскоўскай акупацыяй у Бэсэсэсэрыі.

Вось што знаходзім у «Зьвязьдзе» за 4-га сьнежня 1961 г.:

«У нашай краіне робіцца ўсё, каб жыцьцё чалавека ўвесь час паляпшалася», — выясьняе начальнік «аддзела гаспадарчых тавараў і будматэрыялаў Белкаапсаюза» І. Барысаў.

Дык глянем, як яно паляпшаецца на цёплым фроньце, значыцца ў галіне аграваньня памешканьняў. Вось што піша рэдакцыя «Зьвязды»:

«Гэтымі днямі нам давялося быць у Новай Мышы Баранавіцкага раёна. Старшыня праўленьня мясцовага калгаса «Расьсьвет» А. З. Ерашоў расказвае:

— Для нашай вёскі, а ў ёй жыве каля дзьвюх тысяч сем'яў, пытаньне паліва зьяўляецца праблемным. Лесу ў нас няма. Летам калгасьнікі ўручную нарыхтоўвалі торф на сваім балоце, а вось дроў купіць ня так проста. Праўда, мужчыны неяк знаходзяць выхад — дамаўляюцца зь лясьнічым і ў парадку санітарнай высечкі нарыхтоўваюць тапарняк, валежнік, зьбіраюць гальлё і хоць здалёк, але прывозяць дровы дамоў. А як быць жанчынам-удовам, адзіночкам?

Шэсьць год працуе даяркай калгаса Марыя Лягун. Жанчына палюбіла сваю работу, дабіваецца павышэньня ўдояў малака. Штодзённа занятая на пастаяннай рабоце, яна ня мае часу паехаць у лясьніцтва, заняцца нарыхтоўкай дроў, а потым шукаць транспарт, каб прывезьці дровы зь лесу. Вось і даводзіцца зьвяртацца да шафёраў і выпадкова прыежджых машын, плаціць у тры разы даражэй за машыну дроў ды яшчэ хваляваццa, ці ня ўкрадзены гэтыя дровы зь лесу.

У выніку дрэннай арганізацыі продажу насельніцтву паліва часта паварварску зьнішчаецца лес.

Работнікі бытавога камбіната Палонкаўскага сельпо Іосіф Ліцкевіч і Аляксандар Чарняк сталі на незаконны шлях. Ноччу яны прыехалі ў лес, аблюбавалі самую стромкую сасну, сьпілілі яе, але былі затрыманы работнікам лясной аховы. Па рашэньні суда давялося заплаціць штраф. Нанесены страты дзяржаўнаму лесу . . .»

Вось як яно цікава. Мужчыны неяк зьбіраюць гальлё, тапарняк, уручную капаюць торф, даярка, што выматывае апошнія духі, каб выканаць Мікітавы нормы, і таго ня мае, а іншыя па начах крадуць. Ці-ж ня так было пры польскіх панох у Заходняй Беларусі, ці пры цары? Адно паны зьмяніліся, а народнае багацьце так і асталося ў чужых руках. Дык аб якім паляпшэньні жыцьця можа быць мова?

☆

У пачатку сьнежня ў Менску адбыўся г. зв. рэспубліканскі агляд агітацыйна-мастацкіх брыгад. У вачох марксыстых, як ведама, мастацтвам зьяўляецца прапагандова-агітацыйная мякіна-пацяруха, мэтай якой ёсьць падпіханьне прыгнечаных для максімальнага выкарыстаньня іхных разумовых і фізычных сілаў для эксплятацыі іх пануючымі чырвонымі панамі.

Ад кажнай вобласьці выступалі на прыгаданым аглядзе па тры найлепшыя калектывы. Гэтыя калектывы, паводля «Звязды», «спалучылі ў сваёй творчасьці прапаганду рашэньняў XXII-га зьезду Камуністычнай партыі, агітацыю за камуністычную працу, за раўненьне на маякі, за выкананьне ўзятых сацыялістычных абавязацельстваў . . .»

Коратка тлумачачы на зразумелую людзям мову, гэта было паказваньне ўсім зацікаўленым і абыякавым, як у «краіне найвышэйшага дабрабыту» лупцуюць адстаючых прыгоньнікаў і вучаць, як зьнядужэлыя маюць надрываць і так кволае здароўе, каб усьпець за гэнымі «маякамі» ў тых вар'яцкіх дагонах і перагонах Амэрыкі. Ці-ж даводзіцца гаварыць, колькі там магло быць супольнага з запраўдным мастацтвам?

І вось нехта Б. Стральцоў, рэцэнзуючы гэны «агляд» у «Зьвязьдзе», прыгадвае такі цікавы кавалак: «Брыгада Стаўбцоўскага раённага Дому культуры, як ужо гаварылася, трапіла ў фіналісты. Журы ацаніла яе зусім заслужана. Кампазіцыя тут таксама выразная, жывая. Падабраны добрыя танцавальныя, сольныя і харавыя нумары. А вось пачатак выступленьня выклікае неўразуменне і прыкрасьць. Справа ў афармленні. Праграма называецца «З Вожыкам у калгасе». Гэта назва ў абрамленьні вялікіх карыкатурных партрэтаў носьбітаў перажыткаў мінулага і вядзернага паўліітра гарэлкі ўзвышаецца на жытнёвых снапох над гэрбам Беларускай ССР. Да таго пры пустой сцэне з-за куліс пад гэты малюнак гучыць песня «Беларусь, мая Радзіма, як-жа расьцьвіла ты»! Не прадумалі тут як след стаўбцоўскія таварышы».

Няважна што думае партыйны рэцэнзэнт і як прадумалі праграму «стаўбцоўскія таварышы»: жудасная падсавецкая запраўднасьць, быццам тая вясеньняя вада з-пад лёду, прабіваецца наўзьверх у зусім нечаканых месцах.

✶

У Чыкаго нарадзіўся «Беларускі Праваслаўны Часапіс». Па твары відаць, што нованароджаны паходзіць ад тых самых бацькоў, што дваццаць нумароў таму назад хрысьцілі вуніяцка-нахілены «Беларуская Царква».

Акрамя артыкулаў на царкоўныя тэмы, часапіс маніцца адказаць на такую загадку, як: «Ці могуць быць дзьве БАПЦ?» (Адказ — не!), і паведамляе, як «Весела было ў Чыкага сёлета» (весялосьць, як выглядае, спрычыненая нейкім візытарам з Саўт Рывэру).

Выглядае, што царкоўнае, ці прыцаркоўнае жыцьцё Беларусаў на эміграцыі цяпер павесялее . . .

☆

З нагоды надыйшоўшага кагадзе Новага 1962-га году, сябром і знаёмым, блізкім і далёкім (па адлегласьці) гэтым шляхам перасылаем сардэчныя прывітаньні. Што да пажаданьняў, то хацелася-б, каб жыцьцё ваша каціласа так, як вы самі, там дзе пабудавалі сабе часовыя гнёзды, гэтага зычыце. А там дзесь у будучыні, дай Божа, каб нашы дарогі йзноў сыйшліся на Вольнай Бацькаўшчыне!

М. Козыр

Адказ акадэміку Хацкевічу

(Заканчэньне з 3-яй бачыны)

рускія людзі» ды раіць мне зьвярнуцца з гэтым пытаньнем «да Астроўскага, Абрамчыка, Станкевіча і ўсіх тых, хто дапамагаў гітлераўскім катам фізычна зьнішчаць беларускі народ».

Калі дагэтуль у мяне было крыху веры ў частковую праўдзівасьць савецкіх цьверджаньняў, дык па адказе Хацкевіча на мой ліст нічагусенькі не засталося. Навошта-ж было пасылаць мяне да людзёў, якіх я зусім ня знаю. Хацкевічу спрытней мо было-б адаслаць мяне да вечнае памяці Чарвякова, Некрашэвіча, Галадзеда, Лістапада, Цьвікевіча, Ластоўскага, Янкі Купалы, паслоў польскага сойму, грамадаўцаў Б. Тарашкевіча, С. Рак-Міхайлоўскага, П. Мятлы, паслоў з клюбу «Змаганьне» — І. Дварчаніна, Я. Гаўрыліка, Ф. Валынца, сакратара «Грамады» Бурсевіча ды сьвежае ахвяры камуністычнага «раю» сьв. пам Ус. Краўчанкі, які ня меў магчымасьці пазбавіць сябе жыцьця на бацькаўшчыне, а зрабіў гэта ў чужой Францыі. Можа Хацкевіч хацеў-бы, каб я зьвярнуўся да ўсіх міліёнаў, што загінулі ў падвалах ЧК, НКВД, МВБ і КГБ, на далёкай Поўначы, у Сібіры, Казахстане, на мінных палёх Усходняе Прусіі, куды босых і голых, бяз зброі, бальшавікі сумысьля пасылалі на зьнішчэньне? Можа-б да іх зьвярнуцца, акадэмік Хацкевіч? І сёньня «дабраахвотна пад прымусам» крамлёўскія злачынцы развозяць беларускі народ па сахалінах, камчатках, казахстанах ды іншых сібірных пустэльнях імпэрыі — развозяць ня толькі маладых, але цэлыя сем'і. Вось гэта шляхі, якімі камуністычныя барбары нішчаць народ Беларусі ўжо больш за сорак гадоў. Гэты марксаўска-ленінска-хрушчоўскі генасыд хацкевічы, прокшы й мазуравы са сваімі падпяваламі ўсхвальваюць перад усім сьветам, як свабоду Беларусі. Але дарма! Наш народ вельмі добра ведае ўсіх сваіх прыгнятальнікаў ды іхных памагатых, і ён дачакаецца тае хвіліны, каб адпаведна адудзячыцца.

Наапошкі, я прапаную А. Хацкевічу прыехаць у які-хаця край Заходняй Эўропы або ў Амэрыку зь якім хоча штатам акадэмікаў і правесьці дыскусію на пастаўленыя мною пытаньні. З майго боку ў дыскусіі, апрача мяне, возьмуць удзел яшчэ дзьве асобы. Калі-б такая дыскусія адбылася ў Амэрыцы, забавязваюся пакрыць кошты памешканьня, радыя, тэлевізіі й іншыя выдаткі, зьвязаныя з гэтым — з умовай, што ўсё гаворанае ў часе дыскусіі будзе надрукавана ў газэтах і часапісах БССР.

Чакаю на адказ.

А. Санежка

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011